ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
07.04.2026 № 80

Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў
«У свеце цікавых кніг»
для II–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «У свеце цікавых кніг» (далей – вучэбная праграма) прызначана для II–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

2. На правядзенне факультатыўных заняткаў адводзіцца ў II класе – 34 гадзіны (1 гадзіна на тыдзень), III–IV класах – 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень).

3. Мэта – пашырэнне ўяўлення вучняў аб тэматычнай разнастайнасці беларускай дзіцячай літаратуры; стварэнне ўмоў для развіцця чытацкай адукаванасці вучняў; выхаванне цікавасці да твораў беларускай дзіцячай літаратуры.

4. Задачы:

фарміраванне ўменняў успрымаць, разумець, аналізаваць і інтэрпрэтаваць літаратурныя тэксты розных відаў (мастацкія і навукова-пазнавальныя);

развіццё уменняў самастойнай работы з мастацкімі творамі для дзяцей, даведачным матэрыялам, здзяйснення пошуку дадатковай інфармацыі для вырашэння навучальна-пазнавальных задач;

фарміраванне ў вучняў актыўнага слоўнікавага запасу;

стварэнне ўмоў для асваення камунікатыўнай культуры: умення выказваць ацэначныя меркаванні аб прачытаным і аргументаваць сваю пазіцыю, авалодванне якасцямі культуры маўлення (правільнасць, дарэчнасць, дакладнасць, лагічнасць), правільна карыстацца словамі і выразамі нацыянальнага маўленчага этыкету;

развіццё індывідуальнасці асобы вучня, яе творчай актыўнасці, самастойнасці, крытычнасці мыслення праз літаратурныя гульні і святы, творчыя конкурсы, заняткі з элементамі тэатралізацыі і іншае;

выхаванне патрэбы ў сістэматычным і ўсвядомленым самастойным чытанні;

пашырэнне сацыяльнага і эмацыянальнага вопыту вучняў;

фарміраванне агульначалавечых каштоўнасных арыенціраў, выхаванне грамадзянскіх якасцей асобы;

фарміраванне сродкамі дзіцячай літаратуры чытацкай, інфармацыйнай і іншых відаў функцыянальнай адукаванасці.

5. Зыходзячы з узроставых асаблівасцей вучняў, падчас арганізацыі факультатыўных заняткаў неабходна выкарыстоўваць тыя формы і метады работы, што дазваляюць пазнаёміць вучняў непасрэдна з тэматычнай, зместавай і жанравай разнастайнасцю нацыянальнай літаратуры для дзяцей.

Асноўнымі метадамі і прыёмамі навучання з'яўляюцца: аповед настаўніка з элементамі разважання і доказу; слуханне і чытанне мастацкіх і мастацка-пазнавальных тэкстаў; аналіз тэкстаў з мэтай фарміравання функцыянальнай адукаванасці; выкарыстанне слыхавой нагляднасці ў разнастайных формах (гутарка, пераказ, слоўнае маляванне, апісанне ілюстрацый, выразнае чытанне, арфаэпічна правільнае вымаўленне, інтанацыя) і іншае.

Вядучым прыёмам фарміравання чытацкіх уменняў з'яўляецца аналіз тэксту літаратурнага твора. Аналіз праводзіцца ў форме практычнай работы з тэкстам: акцэнтнае вычытванне ўрыўкаў тэксту з апісаннем учынкаў героя, малюнкаў прыроды, вобразных слоў і выразаў, слоў-носьбітаў характарыстыкі персанажаў, слоў, якія ўказваюць на пачуцці і настрой; пошук адказаў на пытанні настаўніка; вылучэнне сэнсавых частак, складанне плана.

Асноўнымі формамі заняткаў могуць быць правядзенне літаратурных гульняў, выкананне творчых заданняў, падарожжы ў казку, заняткі з элементамі тэатралізацыі, сустрэчы з пісьменнікамі і іншае. Разам з франтальнымі і індывідуальнымі формамі навучання і выхавання неабходна выкарыстоўваць калектыўную, групавую работу, работу ў парах. Рэкамендуецца арганізоўваць такія разнастайныя формы, як вусны часопіс, заняткі-падарожжы, заняткі-гульні, заняткі-святы, калектыўнага асэнсавання і іншае.

Выбар форм, метадаў, прыёмаў навучання і выхавання вызначаецца настаўнікам самастойна, зыходзячы з мэт і задач вывучэння канкрэтнай тэмы, зместу вучэбнага матэрыялу, вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

6. У выніку засваення зместу дадзенай вучэбнай праграмы вучні I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі набываюць:

6.1. асобасныя вынікі:

праяўляе эмацыйна-каштоўнаснае стаўленне да краіны, малой радзімы, традыцый і культурнай спадчыны беларускага і іншых народаў праз набыццё вопыту слухання, чытання і эмацыйна-эстэтычнай ацэнкі твораў мастацкай літаратуры;

прытрымліваецца традыцыйных мадэляў паводзін у жыцці на аснове ўласнага чытацкага вопыту, першапачатковых уяўленняў аб правах і адказнасці, павазе і годнасці чалавека, аб маральна-этычных нормах паводзін і правілах міжасобасных адносін, якія фарміруюцца пры вывучэнні твораў беларускай літаратуры;

праяўляе пазнавальную цікавасць, актыўнасць, ініцыятыўнасць, дапытлівасць і самастойнасць у пазнанні твораў мастацкай літаратуры і творчасці пісьменнікаў;

імкнецца да творчага ўвасаблення сваіх задум ва ўсіх сферах самарэалізацыі на аснове разумення значэння чытання для самаразвіцця, самастойнай арганізацыі чытацкай дзейнасці;

6.2. метапрадметныя вынікі:

аднаўляе паслядоўнасць падзей (сюжэту), выяўляе недахоп інфармацыі для вырашэння вучэбнай (практычнай) задачы на аснове прапанаванага алгарытму;

валодае стратэгіямі асэнсаванага чытання (праглядальнага, азнаямленчага, вывучальнага, пошукавага), якія ўжываюцца для эфектыўнай работы з тэкстам і інфармацыяй;

знаходзіць у мастацкім творы інфармацыю, прадстаўленую ў яўным і няяўным выглядзе; разважае пра змест, форму, мову, структуру тэкставага паведамлення, ацэньвае яго;

карыстаецца даведачнай літаратурай для тлумачэння невядомых слоў і атрымання фактычных даных;

вызначае прычынна-выніковыя сувязі ў сюжэце вывучаемых мастацкіх твораў;

генеруе і развівае ідэі пры абмеркаванні праслуханага (прачытанага) мастацкага твора;

праяўляе рэфлексіўныя ўменні, устанаўлівае прычыны поспеху (няўдач), карэкціруе свае дзеянні для пераадолення памылак;

праяўляе творчы падыход да вырашэння задач пры вывучэнні твораў беларускай літаратуры;

падбірае ілюстрацыі да тэксту, пераказвае яго;

праяўляе паважлівае стаўленне да суразмоўцы і выконвае правілы вядзення дыялогу і дыскусіі;

выказвае эмоцыі пры абмеркаванні прачытанага твора;

6.3. прадметныя вынікі:

чытае мастацкія тэксты усвядомлена, правільна і выразна ў адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення і ў тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага;

умее арыентавацца ў кнізе па назве, змесце, прадмове, пасляслоўі, малюнках;

умее працаваць з тэкстам твора: вызначае тэму і ідэю, дае ацэнку і характарыстыку дзеянням і ўчынкам герояў, вызначае матывы іх паводзін, выяўляе аўтарскі пункт гледжання і выказвае сваё стаўленне да ўчынкаў герояў і падзей, параўноўвае яго з меркаваннем аднакласнікаў; дзеліць тэкст на сэнсавыя часткі, складае яго план;

выяўляе ў тэксце твора асобныя сродкі мастацкага маўлення, устанаўлівае іх функцыі;

стварае слоўныя і графічныя ілюстрацыі па змесце твора;

ствapae творчыя работы на аснове прачытанага твора і ў адпаведнасці з вучэбнай задачай;

ведае прозвішчы асобных дзіцячых пісьменнікаў, чые творы вывучаліся ў межах дадзенай вучэбнай праграмы, назвы і змест твораў, якія найбольш спадабаліся.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### II клас
### (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

#### Уводзіны (1 гадзіна)

Добры дзень, кніга! Роля кнігі ў жыцці чалавека. Вучэбныя, мастацкія і даведачныя кнігі. Элементы іх структуры (вокладка, тытульны ліст, змест). Класіфікацыя кніг па тэмах і жанрах. Правілы карыстання кнігай.

#### Аўтарскія творы малой формы
#### загадкі, хуткагаворкі, лічылкі, калыханкі (2 гадзіны)

А. Беланожка. «Ад зімы да зімы» (Лета. Жніво. Восень).

Р. Бензярук. «Колькі дзетак у двары?» (загадка-задача), «У лясочку…» (лічылка).

А. Спрынчан. Загадкі.

В. Шніп. Загадкі. Хуткагаворкі. Калыханка.

#### У партфелях сшыткі, кніжкі… (3 гадзіны)

Творы пра адносіны да вучобы, вучнёўскіх абавязкаў, узаемаадносіны з аднакласнікамі, настаўнікам і бацькамі.

Р. Бензярук. «Звяры ідуць у школу».

А. Карлюкевіч. «Прашу прабачэння…».

А. Руцкая. «Ігнат і задачкі», «Гора-дапамога», «Памыліўся».

Т. Сівец. «Танечка ідзе ў школу».

В. Шніп. «Певень-настаўнік».

#### Прырода – пра свае прыгоды. Мастачка-восень (2 гадзіны)

Творы пра захапленне прыгажосцю восеньскай прыроды і яе з’явамі.

Т. Атрошанка. «Казка пра маленькую лужынку», «Восеньская казка».

Р. Бензярук. «Мастачка Восень».

В. Драбышэўская. «Павуцінкі».

В. Шніп. «У двары».

#### У родным краі (4 гадзіны)

Творы пра адносіны да Радзімы, прыродныя і дзяржаўныя сімвалы краіны, нацыянальны характар беларусаў.

А. Бадак. «Белая курапатка».

А. Бензярук. «Дапамажы, Мужычок!».

В. Драбышэўская. «Бусляняты».

В. Максімовіч. «Я малы беларус».

М. Пазнякоў. «Беларусь», «Наш гімн».

М. Чарняўскі. «*** Ёсць край, дзе неба…».

Прырода – пра свае прыгоды. Не палохай, зіма! (3 гадзіны)

Творы пра прыгажосць зімовага пейзажу ў прыродзе, дзіцячыя забавы і святы зімой.

А. Беланожка. «Ад зімы да зімы. Загадкі» (Зіма).

Р. Бензярук. «На марозе грэюцца», «Не палохай, зіма!», «Снегіры-моднікі», «Ёлка для Патапкі».

Аўтарскія казкі (4 гадзіны)

Празаічныя і вершаваныя аўтарскія казкі на маральна-этычную тэму.

А. Бадак. «Паўночны кажанок», «Хмарка», «Акварэлькі».

Н. Мацяш. «Два браты і сякера».

З клопатам пра тых, хто побач (6 гадзін)

Творы пра ўзаемаадносіны паміж людзьмі, добрыя і дрэнныя ўчынкі, значэнне стваральнай працы і добразычлівасці ў жыцці.

Р. Бензярук. «Бабры», «Працавітыя шпакі», «Эх і яго браты».

А. Дзеружынскі. «Торт для матулі».

А. Карлюкевіч. «Як Наташка збіралася стаць прыбіральшчыцай».

І. Карэнда. «Электрычка».

А. Стэльмах. «Папяровы самалёцік».

В. Шніп. «Дзятлава будоўля».

А. Якімовіч. «Пчала і муха».

Прырода – пра свае прыгоды. Ідзе вясна-паненка… (3 гадзіны)

Творы пра вясновыя вобразы і змены ў прыродзе вясною.

Р. Бензярук. «Песня ручая», «Чаму Сакавік на Май злуецца», «Фіялка».

В. Максімовіч. «Дзіва-лісточак».

Я малюю тату з мамай (3 гадзіны)

Творы пра любоў, павагу і клопат у сям’і.

Р. Бензярук. «Бульбашы», «Начныя дзівакі».

А. Спрынчан. «Смачная песня пра маму», «Песенька пра нястомнага тату».

В. Ткачоў. «Шчаслівая».

Прырода – пра свае прыгоды. Колькі колераў у лета? (2 гадзіны)

Творы пра прыгажосць летняй пары года, змены ў прыродзе, працу і адпачынак людзей летам.

Г. Аўласенка. «Колькі колераў у лета?»;.

Т. Дамаронак. «Жэнькава лета», «Колькі каштуе сунічнае варэнне?».

Рэзерв (1 гадзіна)

III клас
(35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

Уводзіны (1 гадзіна)

Ад глінянай таблічкі да друкаванай старонкі. З гісторыі ўзнікнення беларускай кнігі (рукапісныя і друкаваныя Бібліі. Летапісы. Сучасныя кнігі). Наш першадрукар – Францыск Скарына.

Аб чым пяе крынічка (3 гадзіны)

Кнігі і творы на тэму вады, пра паходжанне назваў вадаёмаў і іх значэнні ў жыцці чалавека.

Выданні «Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў» і А. Бадака «Водны свет: заалагічныя эцюды» (агляд).

В. Гардзей. «Незабудкі азёр».

А. Карлюкевіч. «Цёплыя назвы Яе Вялікасці Вады».

М. Маляўка. «Цёплае дыханне».

М. Чарняўскі. «Аб чым пяе крынічка».

В. Шніп. «Студня».

Няма Радзімы без бацькоўскай хаты (4 гадзіны)

Творы пра прыгажосць і адносіны да роднай зямлі, Бацькаўшчыны, пра прыродныя сімвалы Беларусі.

У. Караткевіч. «Белавежа».

У. Карызна. «Гэта Радзіма».

У. Мазго. «Адкрыццё».

І. Муравейка. «Наш родны край – прыгожы самы».

П. Панчанка. «Бацькаўшчына», «Няма Радзімы без бацькоўскай хаты».

Я. Сіпакоў. «Шчымліва-непаўторны край».

Слухайце лес (4 гадзіны)

Кнігі і творы пра расліны, ягады і грыбы беларускіх лясоў.

Выданні «Лясная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў», А. Бадака «Расліны: батанічныя эцюды» і «Чырвоная кніга ў казках і вершах» (агляд).

А. Бутэвіч. «Маладзільны клён».

Я. Галубовіч. «Дуб-задавака».

А. Жыгуноў. «Баравічок на скутары».

У. Мазго. «Ажына», «Суніцы», «Касцяніцы», «Брусніцы», «Журавіны».

У жывёльным свеце беларускіх лясоў (3 гадзіны)

Кнігі і творы пра жывёл айчынных лясоў.

Выданні А. Спрынчан «Вершаваная энцыклапедыя жывёльнага свету» і А. Бадака «Жывёлы: заалагічныя эцюды» і «Насякомыя: заалагічныя эцюды» (агляд).

В. Гардзей. «Школа касманаўтаў».

А. Карлюкевіч. «Шубуршун трапляе ў мурашнік».

В. Савасцюк. «Служка-воўк».

Дзе начуе апетыт? (2 гадзіны)

Тэма ежы і беларускіх прысмакаў у навукова-пазнавальным творы.

Я. Сіпакоў. «Што мы ядзім» (скарочана).

З часоў мінулых… (3 гадзіны)

Творы на тэму гістарычна-культурнай спадчыны беларускага народа.

У. Мазго. «Быў тут Статут», «З варагаў у грэкі», «Паясы беларускай красы».

Лепяць ластаўкі гняздзечка ( 6 гадзін)

Кнігі і творы пра птушыны свет беларускіх лугоў, лясоў і балот.

Выданне А. Бадака «Птушкі: заалагічныя эцюды» (агляд).

А. Бадак. «На досвітку», «Балотныя крачкі», «Зязюля», «Варона-гультайка».

В. Гардзей. «Скуль узяўся бусел?», «Чаму кнігаўка просіць піць?».

Р. Ігнаценка. «Ганарлівая птушка».

У. Карызна. «Спяваюць птушкі», «Лепяць ластаўкі гняздзечка».

У свеце прафесій (2 гадзіны)

Тэма адносін да працы і працавітых людзей, роля прафесіі ў жыцці чалавека.

К. Камейша. «Усёўмей».

М. Пазнякоў. «Хто кім будзе?».

У. Шулякоўскі. «Колькі на свеце фрэгатаў?».

Іх лёс апаліла вайна (3 гадзіны)

Творы пра мужнасць і гераізм людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны.

А. Грачанікаў. «Каля помніка партызанскай славы “Прарыў”».

К. Камейша. «Дальва» (скарочана).

Сустрэнемся на стадыёне! (3 гадзіны)

Творы на тэму фізічнай культуры, здароўя і спорту ў жыцці людзей.

У. Бабкоў. «Лыжны крос».

У. Мазго. «Судзейскі свісток, альбо Радасці выток».

М. Пазнякоў. «Варатар», «Гантэлі», «Фігурыстка», «На лыжні».

Рэзерв (1 гадзіна)

IV клас
(35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

Уводзіны (1 гадзіна)

Беларускія пісьменнікі дзецям. Кнігі дзіцячых пісьменнікаў-класікаў (Змітрок Бядуля, Васіль Вітка, Эдзі Агняцвет, Максім Танк, Янка Брыль). Дзіцячыя кнігі сучасных пісьменнікаў (Васіль Жуковіч, Алесь Карлюкевіч, Міхась Пазнякоў, Алесь Бадак і іншыя). Кнігі пісьменнікаў нашага краю.

Зялёныя варотцы (4 гадзіны)

Тэма прыроды і экалогіі.

Г. Аўласенка. «Трэба птушак ратаваць!».

С. Давідовіч. «Жывая вада».

А. Жук. «Хлопцы і яшчаркі».

А. Карлюкевіч. «Пясочнае мора».

Я. Пархута. «Жыві, мая Бярэзіна!» («Рака змагаецца за права жыць»).

Нашы славутыя суродзічы (3 гадзіны)

Творы пра славутых асоб гістарычнага мінулага і сучаснасці.

В. Вітка. «Салдат з дзяўчынкай на руках».

У. Мазго. «Францыск Скарына», «Сымон Будны», «Беларускі Напалеон», «Сустрэча ў Смольні».

Я. Сіпакоў. «Нашы людзі» (скарочана).

Роднае (2 гадзіны)

Кнігі і творы патрыятычнай тэматыкі.

Выданне «Адзін народ, адзіная Радзіма» (агляд).

Г. Аўласенка. «Да Дня Незалежнасці».

П. Броўка. «Родныя словы».

Г. Бураўкін. «Брэсту».

М. Пазнякоў. «Роднае», «Я нарадзіўся тут і рос».

### У чароўным свеце казкі (5 гадзін)

Беларускія народныя і аўтарскія казкі.

Выданні зборнікаў «Беларускія народныя казкі» (розных гадоў). Агляд.

Беларуская народная казка «Мужык і жонка».

Беларуская народная казка «Як лянівая дачка працаваць навучылася».

У. Мазго. «У сонейка ў гасцях».

Н. Мацяш. «Казка пра суседзяў, змяю і мядзведзя».

М. Чарняўскі. «Замест аўтографа».

### У свеце мастацтва (3 гадзіны)

Кнігі і творы на тэму мастацтва, славутых асоб культуры.

Выданне М. Маляўкі «Спадчына, або Каб не стаць манкуртам» (агляд).

М. Маляўка. «Самі ткалі, самі вышывалі» («Кросны», «Пранік, качалкі, валок», «Абрусы», «Ручнікі», «Паясы»).

В. Лукша. «Аркестр» (скарочана).

### Хлебны шлях (4 гадзіны)

Тэма стваральнай працы, ураджаю і адносін да хлеба.

Г. Атрошчанка. «Талака».

А. Зэкаў. «Хлебны шлях».

А. Куляшоў. «Колас».

Р. Мінулін. «Залаты хлеб».

М. Пазнякоў. «Жыта», «Жніво», «Побач з татам», «Клавін тата».

### У свеце дабрыні і міласэрнасці (4 гадзіны)

Творы на тэму добразычлівасці, клопату пра людзей і карысці грамадству.

Г. Атрошчанка. «Міласэрнасць».

В. Карась. «Не сумуй, фартэпіяна!».

В. Хомчанка. «Білеты ў цырк».

### У свеце жарту і гумару (2 гадзіны)

Тэма жарту і гумару ў творах нацыянальнай літаратуры.

Г. Аўласенка. «Як Вася Лайдачкін скарб шукаў».

А. Басікірская. «У краме» (урывак з паэмы «Быль пра шкодніка Сёму»).

У. Мазго. «Дзівак Сіваграк», «Ці ёсць у Слоніме сланы?».

У жыце цвілі васількі (4 гадзіны)

Тэма мужнасці, гераізму і ахвярнасці жыцця асобы падчас падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Выданні «Я помню ўсё…» і серыя кніг «Дзеці вайны» (агляд).

А. Бачыла. «Песня пра герояў Брэсцкай крэпасці».

А. Дзеружынскі. «Сярожа знайшоўся».

Я. Пархута. «У жыце цвілі васількі» («Беларускі “Артэк”», «Ліпічанскі Сусанін»).

У. Паўлаў. «Легенда пра капітана Гастэлу».

Убачыць зоркапад! (3 гадзіны)

Кнігі і творы фантастычных і рэальных карцін космасу і Сусвету.

Выданні «Касмічная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў» і Р. Баравіковай «Казкі астранаўта» (агляд).

А. Зэкаў. «Паехалі!», «Касмічныя сталіцы».

М. Мятліцкі. «Ёсць планета».

К. Ладуцька. «Начальнік Байканура».

Рэзерв (1 гадзіна)